**Касцюкевіч, Д.** Назаўсёды ў нашых сэрцах / Д. Касцюкевіч // Міёрскія навіны. – 2016. – 27 лют. – С. 2.

## НАЗАЎСЁДЫ Ў НАШЫХ СЭРЦАХ

**Вечарыну памяці воіна-афганца Сяргея Шляпава правялі васьмікласнікі Цвецінскай ДС-СШ у дзень 27-й гадавіны вываду савецкіх войск з Афганістана. Імя байца, які назаўсёды застаўся ў краіне гор і пяскоў, носіць наш піянерскі атрад.**

Сяргей Мікалаевіч нарадзіўся ў вёсцы Забор'е Язненскага сельсавета, скончыў Істаўскую школу, працаваў трактарыстам у саўгасе «Дзісенскі». У армію прызываўся з Міёрскага раёна і загінуў у Афганістане 24 сакавіка 1985 года, выконваючы свой воінскі абавязак.

…Калона аўтамашын, сярод якіх быў і «КамАЗ» Сяргея Шляпава, дастаўляла авіябензін і боепрыпасы ў Кабул. У даліне каля перавалу Саланг зрабілі прывал. У гэты час душманы агнём з гор накрылі калону…

Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, наш зямляк пахаваны ў вёсцы Іст.

Гартаючы старонкі жыцця воінаў-інтэрнацыяналістаў, мы гаварылі пра воінскі абавязак і прысягу, пра трагічную афганскую вайну, якая доўжылася ўдвая больш, чым Вялікая Айчынная. Вечарына завяршылася хвілінай маўчання, пасля чаго з кветкамі адправіліся на магілу Сяргея Шляпава.

Ніколі-ніколі больш не павінна быць войнаў, не павінны плакаць маці, што не дачакаліся адтуль сваіх сыноў.

**Даша Касцюкевіч, вучаніца Цвецінскай ДС-СШ**